

АРЭНДА ЖЫЛЛЯ Ў СТАЛІЦЫ **4**

ПЯЦЬ УЗНАГАРОД НА КУБКУ СВЕТУ **16**



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

28 МАЯ 2019 г. АЎТОРАК № 97 (28964)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ТУРЧЫН, першы намеснік прэм'ер-міністра**

*«ВУП Беларусі ў студзені — красавіку вырас на 1,4 працэнта ў параўнанні з аналагічным перыядам 2018 года. Для карэкціроўкі прагнозу па росце ВУП пакуль падстаў няма. Думаю, што многія праблемы павінны вырашыцца ў найбліжэйшы час: мы падцягнем экспарт, выконваючы даручэнне Прэзідэнта. Што датычыцца сацыяльных пытанняў, урад будзе надаваць асаблівую ўвагу арганізацыям з нізкім узроўнем аплаты працы. Усе даручэнні дадзены, мы гэта будзем жорстка кантраляваць. Першы этап — гэта тыя арганізацыі, якія плацяць людзям зарплату менш за Br400. Да 1 ліпеня ў краіне такіх прадпрыемстваў быць не павінна. Тут два складнікі: эфектыўнасць работы гэтых прадпрыемстваў і прыняцце кіраўніцкіх рашэнняў. А наступны этап работы — на 1 студзеня 2020 года — гэта прадпрыемствы з заработнай платай ніжэй за Br500».*

## КОРАТКА

- **ЦВК прапануе правесці выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў 17 лістапада, членаў Савета Рэспублікі — 7 лістапада.**
- Грузавікі ў Мінску падчас Еўрапейскіх гульняў будуць ездзіць раніцай, познім вечарам ці ўначы.
- **Беларускім урачам рэкамендавана спыніць прызначэнне лекаў ад кашлю з утрыманнем фенспірыду.**
- У Крупскім раёне егер атрымаў агнястрэльнае раненне ў галаву. Той, хто страляў, з месца злачынства збег, але быў затрыманы супрацоўнікамі УУС Мінскага аблвыканкама. Пацярпелы знаходзіцца ў рэанімацыі.
- **Паказальнае кармленне мядзведзяў правядуць у Мінскім заапарку 1 чэрвеня.**

ISSN 1990 - 763X

# АДНАКЛАСНІКІ



Шчаслівых пар, якія жывуць у згодзе і любові болей за паўвека, у нас нямала. Калі прыадкрыць таямніцу кахання такіх шлюбных саюзаў, пачуеш шмат цікавых, павучальных і кранальных гісторый. Напрыклад, пра тое, як сужэнцы ў свой час хадзілі ў адну і тую ж школу і нават у адзін клас. Да гэтых шчаслівых належаць і жыхары вёскі Сабалі Чашніцкага раёна Уладзімір і Нэлі ЯСНЫЯ *(на фота)*. Менавіта так, са школы, пачаўся шлях іх саюзу. У пары Ясныя жывуць ужо пяцьдзесят тры гады. Нягледзячы на паважны ўзрост, жывуць на радасць сабе і сваім дзецям, унукам, клапоцяцца і шануюць адно аднаго.

— Мы — дзеці вайны, жылі пад акупацыяй, ведаем, што такое бяда і нястача. А як вайна скончылася, пайшлі ў школу — хацелася вучыцца, — кажуць Уладзімір Іосіфавіч і Нэлі Сямёнаўна. — Школа была ў іншай вёсцы, за пяць кіламетраў — мы разам туды хадзілі. Але наш раман пачаўся значна пазней.

Нэлі вучылася да дзясятага класа, а Уладзімір скончыў толькі восем — трэба было дапамагаць маці-ўдаве зарабляць на хлеб, прыйшлося ўладкавацца ў калгас. Яшчэ да армейскай службы хлопца ў маладых людзей узніклі пачуцці, але яны не сталі адкладваць сваё вяселле на потым — узялі шлюб. Калі нарадзілася першая дачка, неспадзявана Уладзіміра прызвалі ў войска і тры гады Нэлі чакала свайго салдата.

Ад таго разу яны ніколі больш не разлучаліся.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Летні адпачынак

## АЗДАРАЎЛЕНЧЫ МАРАФОН — НА СТАРЦЕ!

### Якія «фішкі» чакаюць гродзенскіх школьнікаў падчас канікул

**І гэта не толькі прышкольныя ці загарадныя ўстановы ў маляўнічых мясцінах. Усё большую папулярнасць набываюць турыстычныя, ваенна-спартыўныя, навуковыя, профільныя летнікі. Сёлета ўпершыню арганізаваны адпачынак для аграрных класаў. Школьнікі будуць сумяшчаць аздараўленне з вытворчым турызмам. Летнікі, а іх у рэгіёне будзе працаваць каля адной тысячы, прымуць дзяцей з першых дзён канікул, а завершаць работу ў самым канцы жніўня.**

СТАР. 13



Жыллё мае

## ЦІ «СКОКНУЛА» АРЭНДА ПЕРАД ГУЛЬНЯМІ?

**Патэнцыйныя кватаранты паведамляюць у рэдакцыю, што сёлета варыянтаў здымнага жылля ў Мінску стала прыкметна менш. А тыя, хто ўжо арандуе, расказваюць, што гаспадары падымаюць аплату на 30—50 долараў са словамі «ўсё даражэе» ці нават спасылаюцца на блізкасць Еўрапейскіх гульняў. Што сапраўды адбываецца на рынку сталічнай арэнды і які прагноз па цэнах на жыллё можна чакаць да канца года? З гэтымі пытаннямі мы звярнуліся да спецыялістаў.**

### Запланаванае падаражанне

Кошты арэнды кватэр у галоўным мегаполісе краіны трымаліся нязменнымі два з паловай гады — з пачатку 2016 года, калі іх зніжэнне спынілася, і па лета 2018-га. Сярэдняя цана арэнды жылля стандартных спажывецкіх якасцяў у той час была на ўзроўні 190—200 долараў у месяц для аднапакаёвых кватэр, 240—250 долараў для двухпакаёвых, а трохпакаёвую можна было арандаваць нават за 260 «зялёных». І гэтыя цэны паказаны без уліку камунальных плацяжоў і актуальныя для кватэр, у якіх зарэгістраваны хаця б адзін чалавек. Яны сапраўды вельмі доўга не рухаліся.

А вось летам мінулага года, перад пачаткам навучальнага сезона, цэны сталі падымацца. Спачатку гэтаму не надавалі асаблівага значэння, бо заўсёды знаходзяцца ўласнікі, якія ў гэты перыяд спрабуюць «згуляць» на часовым дэфіцыце. Але прыход зімы не вярнуў цэны на ранейшае месца, а толькі замацаваў іх рост сёлета.

Начальнік аддзела арэнды жылля агенцтва нерухомасці «Твая сталіца» Маргарыта Пачыцкая адзначае, што, сапраўды, цяпер цана арэнды жылля ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года вырасла на 5—10 %. Акрамя таго, больш за ўсё падаражанне кранула аднапакаёвыя кватэры — за кошт высокага на іх попыту. А трохпакаёвыя, наадварот, менш за ўсё.

СТАР. 4

# ДА ЮБІЛЕЮ — У НУР-СУЛТАН

**Сёння пачынаецца двухдзённы рабочы візіт Аляксандра Лукашэнкі ў Казахстан. Кіраўнік дзяржавы прыме ўдзел у пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета.**

Мерапрыемства адбудзецца ў Нур-Султане ў вузкім і пашыраным складах. З улікам юбілейнай даты, пяцігоддзя Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе, лідары дзяржаў не толькі абмяркуюць вынікі развіцця саюза, але і вызначаць далейшыя перспектывы сумеснай работы па паглыбленні еўразійскай інтэграцыі, якаснай рэалізацыі дамоўленасцяў, якія ўжо маюцца.

Якія яшчэ пытанні вынесены на саміт? Яны датычацца пашырэння міжнароднага супрацоўніцтва ЕАЭС, фарміравання агульнага электраэнергетычнага рынку саюза і ўзаемадзеяння ў мытнай сферы. Акрамя таго, будуць абмяркоўвацца і асноўныя арыенціры макраэканамічнай палітыкі на 2019—2020 гады, ход рэалізацыі лічбавага парадку дня, стварэнне Савета па прамысловай палітыцы ЕАЭС і шэраг іншых аспектаў.

Вядома, па выніках мерапрыемства плануецца прыняцце адпаведных міжнародных дакументаў. Запланаваны і двухбаковыя сустрэчы, перамовы Аляксандра Лукашэнкі з замежнымі лідарамі.

**Паводле БелТА.**

# Эканоміка ўмацоўваецца кантрактамі

**28 краін свету былі прадстаўлены на Гомельскім эканамічным форуме, які сабраў паўтысячы гасцей. Прадстаўнікі ўлад, дыпмісій і бізнес-колаў у горадзе над Сожам ацэньвалі эканамічны і інвестыцыйны патэнцыял вобласці. Сярод пастаянных партнёраў — Расійская Федэрацыя, Украіна, Казахстан, Кітай, Італія. Сёлета ўдзел у форуме ўзялі яшчэ і дэлегацыі Узбекістана, Румыніі, Бельгіі, Катара, Пакістана, Індыі.**



Фота БелТА.

Агульная вага партфеля кантрактаў складзе каля 130 мільёнаў долараў. Практычна ўсе дамовы — у сферы рэальнага сектара эканомікі. Інвестыцыі чэшскай кампаніі, напрыклад, будуць накіраваны на «Гомельбудматэрыялы». Там запланаваны праект рэканструкцыі цэха цеплаізаляцыйных матэрыялаў на 30 мільёнаў еўра са стварэннем 70 рабочых месцаў. Для замежнага інвестара гэта другі праект у Беларусі: адзін ужо рэалізуецца ў Віцебскай вобласці.

На тэрыторыі СЭЗ «Гомель-Ратон» эстонская кампанія Kaamos Group мае намер пабудаваць дрэваапрацоўчы завод праектнай магутнасцю больш за 160 тысяч кубаметраў піламатэрыялаў штогод. Тут будзе створана 100 працоўных месцаў.

У Гомелі плануюць пабудаваць сэрвісны цэнтр па рамонце грузавых аўтамабіляў «Вольва» і паўпрычэпаў «Шміцт». Аб'ём капітальных укладанняў складзе 1,5 мільёна долараў. Работу атрымаюць 50 чалавек.

Таксама ў планах арганізацыя трыкатажных палотнаў на фабрыцы «Белфа» ў Жлобіне, гідраапаратуры — на СЭЗ «Гомель-Ратон», другасная перапрацоўкі палімерных матэрыялаў у Буда-Кашалёўскім раёне і перапрацоўкі адходаў металургіі ў Жлобінскім. А яшчэ — будаўніцтва камбіната па здабычы каалінавай гліны на Жыткаўшчыне. Пратакол аб намерах падпісалі Рагачоўскі малочна-кансервавы камбінат і ТАА «Юніком». Расійская кампанія мае намер прасоўваць і рэалізоўваць рагачоўскую малочку ў Расіі на суму каля 35 мільёнаў долараў штогод.

— За шаснаццаць гадоў Гомельскі эканамічны форум вырас да маштабнага міжнароднага мерапрыемства, якое штогод збірае сотні прадстаўнікоў дзелавых колаў і афіцыйных асоб з розных дзяржаў, — адзначыў **выконваючы абавязкі старшыні, першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ.** — Сёння форум па праве носіць статус галоўнага дзелавога сходу вобласці, у актыве якога 97 падпісаных дакументаў на суму амаль два з паловай мільярды долараў. Больш за 50 % з іх ужо выкананы ці знаходзяцца ў стадыі рэалізацыі. Інвестыцыйная прывабнасць краіны — гэта больш, чым спрыяльныя падатковыя і гандлёвыя рэжымы. Гэта таксама ўзаемны давер органаў улады і бізнесу, дзяржаўна-прыватнае партнёрства, палітычная стабільнасць, сумленныя правілы гульні. Падобныя форумы — не толькі платформа для ўмацавання існуючых міжрэгіянальных сувязяў, але і магчымасць усталявання новых дзелавых і сяброўскіх кантактаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Падзея

# ПА ТОЙ БОК ТРАКТАРА

**У нядзелю, 26 мая, на аршанскім інструментальным заводзе холдынга МТЗ усім ахвотным паказалі вытворчасць — тут упершыню зладзілі Дзень адчыненых дзвярэй.**



У райцэнтры падзея стала асаблівай, бо была прысвечана 45-годдзю заснавання мясцовага прадпрыемства — а сёлета ўвайшло ў холдынг.

Юным наведвальнікам, якім хутка выбіраць прафесію, спадабаліся ўмовы працы і агучаная магчымасць добрага заробку.

Дарэчы, як паведаміў **дырэктар прадпрыемства Віталь МАНКЕВІЧ,** добрыя станочнікі атрымліваюць па 1,5 тысячы рублёў штомесяц. І гэта не мяжа, улічваючы ўмовы фінансавага заахвочвання пры здзельнай аплаце працы. Кіраўнік з гонарам расказаў пра новае абсталяванне, планы супрацоўніцтва з замежным інвестарам, мадэрнізацыю прадпрыемства, якую неабходна завяршыць у 2023 годзе.



Цікава, між іншым, што сярод станочнікаў ёсць і жанчыны. А кіруе цэхам, дзе яны працуюць, таксама прадстаўніца прыгожай паловы чалавецтва Аксана Кірыковіч. Аршанка прыйшла на завод праз год пасля яго адкрыцця. Тут у 1976-м яе вучылі працаваць на станках. Потым паступіла на завочнае аддзяленне ў Беларускі політэхнічны інстытут, працавала тэхнолагам, начальнікам тэхналагічнага бюро, і вось цяпер — начальнік інструментальнага цэха. У яе каля дваццаці пяці падначаленых, у тым ліку тры жанчыны.

А ўсяго на Аршанскім інструментальным заводзе цяпер працуюць каля 400 чалавек. **Ветэран вытворчасці Леанід РЫЗОЙ** пачаў тут працаваць яшчэ да афіцыйнага адкрыцця. Завадчанін займаў розныя пасады: тэхнолага, вядучага інжынера, намесніка дырэктара... Памятае, што ў лепшыя часы на прадпрыемстве было занята каля 2,7 тысячы чалавек. Завод быў стратэгічна важным аб'ектам для ўсяго былога СССР. Ён быў адкрыты па дзяржаўным заданні ўрада як спецыялізаванае прадпрыемства па забеспячэнні металаапрацоўчым інструментам і станочнай аснасткай іншых вытворцаў. Ветэранам вельмі рады таму, што кіраўнік дзяржавы асабіста клапоціцца, каб завод атрымаў другое жыццё. Перажывае, што не хапае моладзі.

Пра неабходнасць больш актыўна рэкламаваць рабочыя спецыяльнасці сказаў **памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці Віталь ВОЎК.** Ён лічыць, што калі на прадпрыемствах будуць праводзіць экскурсіі для хлопцаў і дзяўчат, тыя зменяць сваё разуменне спецыфікі рабочых прафесій. Старанныя рабочыя цяпер вельмі запатрабаваныя. У наш час той жа станочнік, які будзе працаваць на новым абсталяванні, павінен быць адукаваны на ўзроўні выпускніка ВНУ. І гэта трэба ўлічваць пры падрыхтоўцы спецыялістаў.

**Першы намеснік старшыні Аршанскага райвыканкама Сяргей ПАЦ** лічыць, што Дзень адчыненых дзвярэй стане добрай традыцыяй у Аршанскім рэгіёне. Гэта — магчымасць паказаць землякам, што зроблена ў рамках выканання даручэнняў Прэзідэнта. Адпаведны ўказ, накіраваны на развіццё рэгіёна, дае шанц Аршаншчыне стаць лакаматывам эканомікі ўсёй паўночнай вобласці. І вытворчасць ужо робіць першыя крокі ў бок аздараўлення.

На мерапрыемстве адбыліся цырымонія ўшанавання найлепшых супрацоўнікаў, святочны канцэрт з удзелам творчых калектываў Аршанскага раёна. Былі арганізаваны выязны гандаль, выстаўка трактарнай тэхнікі, працавалі дзіцячыя атракцыёны. Дзятве асабліва спадабалася катанне на трактары.

Падчас экскурсіі людзі шчыра дзяліліся прыемнымі ўражаннямі. Напрыклад, гараджанка Вольга Токараўская прыйшла з бацькамі, якія тут працавалі, і маленькім сынам. І была вельмі задаволеная ўбачаным. А з імі за кампанію на экскурсіі былі аднакласнікі малога і іх настаўніца Галія Кісялёва. І яе маці тут працавала. Жанчына рада, што прадпрыемства мадэрнізуецца літаральна на вачах.

А **былы дырэктар прадпрыемства Валерый ЛУТАЙ, лаўрэат звання «Чалавек года Віцебшчыны»,** прыйшоў сустрэцца з калегамі і разам парадавацца добрым пераменам. Завод ён узначальваў з 2005 да 2016 года. Ён упэўнены, што пры падтрымцы кіраўніцтва краіны ў завода добрыя перспектывы.

Жыхарам Оршы і наваколля гэты нядзельны выхадны запомніцца надоўга. Бадай, новая традыцыя — прамысловы турызм — нараджаецца ў райцэнтры, назва якога на ўсіх на слыху.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### Извещение о проведении открытых аукционов по продаже земельных участков в частную собственность

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 24-63-14

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
| --- |
| **Лот № 1.** Земельный участок с кадастровым № 220881245101000056, площадью 0,1594 га, по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, Видзовский с/с, д. Подворинка, участок № 1 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранные зоны особо охраняемых природных территорий (Национальный парк «Браславские озера»), водоохранная зона рек, водоемов (озеро Видзовское), охранная зона электрических сетей до и свыше 1000 В. **Начальная цена**: 2000,00 бел. руб. **Размер задатка:** 200,00 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY44AKBB36003120200020000000, г. Минск ОАО «АСБ Беларусбанк» IBAN AKBBBY2X, УНП 300594330 (Видзовский сельсовет) |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 01.07.2019 в 12.00 по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, г. Браслав, ул. Советская, 119 в Браславском районном исполнительном комитете. **Срок внесения задатков и приема документов:** с 28.05.2019 с 8.30 по 28.06.2019 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни. **Условия аукциона:** обратиться в течение двух месяцев со дня утверждения протокола аукциона за государственной регистрацией прав на зем. участок в Браславское бюро Полоцкого филиала РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»; разработать и утвердить в установленном порядке проектно-сметную документацию на строительство объекта в срок, не превышающий 2 (два) года; произвести занятие (освоение) зем. участка не позднее 1 (одного) года со дня утверждения проектной документации на строительство жилого дома; до начала строительства снять плодородный слой почвы в местах размещения строений и сооружений и использовать его в соответствии с проектной документацией |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка, начальная цена |
| --- |
| Лот № 1. Земельный участок с кадастровым № 223383509101000035, площадью 0,2499 га по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, Перебродский с/с, д. Зачеревье для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (озеро Обстерно, озеро Нобисто), охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 В, придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильной дороги. **Нач. цена:** 3 000,00 бел. руб. **Задаток:** 300,00 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY09AKBB36003210700720000000 ОАО «АСБ Беларусбанк» БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Перебродский с/с) |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 01.07.2019 в 14.30 по адресу: Витебская обл., г. Миоры, ул. Дзержинского, 17 в Миорском районном исполнительном комитете. **Срок внесения задатков и приема документов:** с 28.05.2019 с 8.30 по 28.06.2019 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни. **Условия аукциона:** обратиться за гос. регистрацией прав, ограничений прав на зем. участок в течение двух месяцев со дня проведения аукциона; получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома; приступить к занятию данного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления в течение 1 года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство капитального строения (здания, сооружения); осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД |

Аукционы проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь, консолидированные участники (двое и более граждан Республики Беларусь). Для участия в аукционе граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином — копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина — нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками — оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) — документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 — зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт.тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by

Гучная справа

# ЗАБОЙСТВА БІЗНЕСМЕНА РАСКРЫТАЕ

**Раніцай 26 верасня 2016 года на ўскраіне горада Беразіно загарэўся аўтамабіль. Калі ратаўнікі патушылі полымя, яны знайшлі абгарэлы труп. Асоба загінулага была ўстаноўлена хутка. Ім аказаўся мясцовы бізнесмен Сяргей Мяцельскі. І вось учора на брыфінгу прадстаўнікі Следчага камітэта заявілі: злачынства раскрытае.**

— Пачатковы этап расследавання характарызаваўся пэўнымі складанасцямі, — сказаў **першы намеснік начальніка галоўнага следчага ўпраўлення Следчага камітэта Васіль ГАЛЬ.** — Было высветлена, што ў дзень забойства, 26 верасня 2016 года, Мяцельскі а сёмай гадзіне раніцы выехаў з дома. Ён збіраўся ехаць у Мінск. Злачынец сеў да яго ў машыну каля дома, і яны выехалі разам на дарогу Беразіно — Барысаў. На скрыжаванні з трасай Мінск — Магілёў злачынец стрэліў у Мяцельскага, пасля чаго падпаліў машыну і ўцёк.

Злачынства адбылося ў час, калі па трасе актыўна рухаўся транспарт. Неўзабаве пасля забойства каля машыны спыніўся аўтамабіль, з якога выйшаў супрацоўнік МНС паглядзець, што здарылася. Але ён быў вымушаны рэціравацца, бо забойца стрэліў у паветра.

Пакінутыя сляды дазволілі сабраць пэўную інфармацыю пра кілера. Гэта быў мужчына ва ўзросце прыкладна 40 гадоў, спартыўнага целаскладу, ростам каля 170 см, апрануты ў камуфляж.

Версіі разглядаліся розныя. І тое, што бізнесмена застрэліў чалавек, які пазычыў у яго грошы. І забойства з карыслівых меркаванняў: загінулы неабнаравала вазіў з сабой буйныя сумы. Не выключалася забойства, звязанае з камерцыйнай дзейнасцю. Разглядаўся таксама варыянт помсты.

Пачаўся аналіз дакументаў. І вось у канцы тунэля замігцела святло — з 2011 года выдаткі бізнесмена пачалі істотна перавышаць яго афіцыйныя даходы. Больш за тое, ён пачаў пазычаць буйныя сумы грошай, рабіў дарагія пакупкі. Але ніякіх дакументаў не засталося — усё было аформлена на падстаўных асоб або наогул праходзіла па прынцыпе даверу.

Маніторынг тэлефонных размоў дапамог высветліць, што забіты бізнесмен супрацоўнічаў з шэрагам расійскіх кампаній. З тымі ж фірмамі быў звязаны менеджар па прозвішчу Касяк, якога застрэлілі праз паўтара месяца пасля інцыдэнту ў Беразіно. Падазраваных у гэтым злачынстве затрымалі хутка. Яны атрымалі вялікія турэмныя тэрміны — 23 і 24 гады ў калоніі ўзмоцненага рэжыму. І вось у кастрычніку 2018 года адзін з іх напісаў яўку з павіннай, дзе ўказаў, што забіць Сяргея Мяцельскага яму загадаў яго падзельнік. Агучаны быў і кошт пытання — 30 тысяч долараў. Праз некаторы час і той таксама напісаў яўку з павіннай.

Вядома, што забойца служыў у адным са спецпадраздзяленняў і выдатна валодаў зброяй. Замоўца ж працаваў кіроўцам у забітага менеджара. У мінулую пятніцу справа была перададзена ў Мінскі абласны суд.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# Спецыяльныя месцы, пандусы, валанцёры...

**Спартыўныя аб'екты будуць даступнымі для ўсіх**

**У Мінску амаль 1900 людзей з інваліднасцю сістэматычна займаюцца спортам і фізкультурай. Яшчэ больш сярод іх спартыўных балельшчыкаў. І, зразумела, многія з іх захочуць наведаць такую яркую падзею, як II Еўрапейскія гульні ў Мінску. Спартыўныя аб'екты спецыяльна рыхтуюцца для таго, каб быць даступнымі для ўсіх катэгорый гледачоў.**

— У прыватнасці, удасканальваюцца іх элементы безбар'ернага асяроддзя, — расказала журналістам **старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Жанна РАМАНОВІЧ.**

На сённяшні дзень, па словах Жанны Рамановіч, усе спартыўныя аб'екты знаходзяцца ў завяршальнай стадыі падрыхтоўкі да правядзення гульняў. Так, у спартыўным комплексе «Мінск-Арэна» спраектаваны спецыяльны пад'ём для размяшчэння гледачоў, якія маюць інваліднасць. На веладроме «Мінск-Арэны» для іх адведзены месцы на трыбуне С (для інвалідаў-калясачнікаў будуць спецыяльна абсталяваныя месцы ў 8-м радзе). У САК «Алімпійскі» для фізічна аслабленых асоб таксама выдзелены спецыяльныя месцы на трыбунах.

Для прагляду спаборніцтваў па баскетболе ў Palova Arena зона для калясачнікаў будзе арганізавана на ўзроўні спаборніцкай пляцоўкі. Безбар'ернае асяроддзе (ліфты, пандусы, спецыяльныя санвузлы) забяспечана і ў «Чыжоўка-Арэне», гарадскім цэнтры алімпійскага рэзерву па тэнісе, спартыўна-стралковым комплексе імя Цімашэнкі.

Для прагляду спаборніцтваў па веласіпедным спорце ў раёне Кастрычніцкай плошчы людзі з інваліднасцю змогуць прыпаркаваць свой транспарт на плошчы Свабоды. І ў цэлым на ўсіх аб'ектах запланаваны стаянкі для спецаўтатранспарту. Прычым паркавачныя месцы для інвалідаў-калясачнікаў будуць размешчаны на адлегласці 150—350 м ад уваходаў у будынкі.

Калі ж паўстане якая-небудзь праблема ці цяжкасць, людзі з інваліднасцю заўсёды змогуць звярнуцца да валанцёраў.

**Святлана БУСЬКО.**

Сугучча

# «Санеты» па-мангольску

**У Купалаўскім музеі прымалі мангольскага перакладчыка і публіцыста**

**Мангольскі літаратар Бадам-Ачырын Галаарыд не ўпершыню наведваецца ў Беларусь. Гэтым разам ён прымаў удзел у XIV Беларускім міжнародным медыяфоруме, які праходзіў у Брэсце. Але ў спадара Галаарыда ёсць і літаратурныя зацікаўленні. Ён прывёз у Купалаўскі музей адмысловы падарунак — пераклад на мангольскую мову «Санетаў» Янкі Купалы, якія пабачылі свет на Улан-Батары ў пераўвасабленні менавіта Бадама-Ачырына Галаарыда.**

— Падчас размовы з мангольскім госцем мы абмеркавалі розныя тэмы супрацоўніцтва, сяброўства, — расказвае **дырэктар музея Алена ЛЯШКОВІЧ.** — Спадар Галаарыд выказаўся пра тое, што варта было б правесці ў Манголіі выстаўку, прысвечаную жыццю і творчасці Янкі Купалы. Мангольскі пісьменнік займаецца і тэлевізійнымі праектамі. Магчыма, сам лёс народнага песняра Беларусі стане тэмай аднаго з тэлевізійных фільмаў у Манголіі. Была дасягнута дамоўленасць, што ў верасні ў нашым музеі адбудзецца прэзентацыя мангольскай кнігі Купалы. Дарэчы, яшчэ раней ва Улан-Батары асобна была выдадзена па-мангольску паэма «Над ракой Арэсай».

У сябе на радзіме Бадам-Ачырын Галаарыд вядомы журналіст і перакладчык. Ён пераклаў на мангольскую мову раман «Вялікі Гэтсбі» Фрэнсіса Скота Фіцджэральда, «Гісторыю» Герадота, зборнік апавяданняў Джэка Лондана «Сэнс жыцця». Зараз, пабываўшы ў Мінску, у Брэсце, дзе праходзілі асноўныя мерапрыемствы міжнароднага медыяфоруму, спадар Бадам-Ачырын Галаарыд выказвае розныя ініцыятывы, якія спрыялі б супрацоўніцтву Беларусі і Манголіі ў галіне культуры, літаратуры, мас-медыя.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЛАГІСТЫКА ЕЎРАПЕЙСКІХ ГУЛЬНЯЎ

**Зацверджана Канцэпцыя дзейнасці гарадскіх інфармацыйных пунктаў падчас II Еўрапейскіх гульняў. Дакумент быў падрыхтаваны супрацоўнікамі кафедры міжнароднага турызму факультэта міжнародных адносін БДУ пры падтрымцы фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года».**

У канцэпцыі прапісаны механізм працы валанцёраў і забеспячэння інфармацыйнай падтрымкай гасцей горада ў перыяд правядзення спартыўных мерапрыемстваў. Плануецца, што з 19 чэрвеня пачнуць працаваць каля 20 гарадскіх інфармацыйных пунктаў на сталічных пляцоўках, а таксама прылеглых да аб'ектаў спаборніцтваў тэрыторыях. У іх ліку Нацыянальны аэрапорт «Мінск», аўтавакзал «Цэнтральны», чыгуначны вакзал «Мінск-Пасажырскі», Студэнцкая вёска, фан-зоны, асноўныя турыстычныя маршруты сталіцы... Тут размесцяцца інфармацыйныя палаткі і стойкі, дзе можна будзе атрымаць звесткі пра графік і месцы правядзення спаборніцтваў, інфраструктуру горада, грамадскага транспарту і іншую карысную для гасцей інфармацыю.

Таксама валанцёры забяспечаць усіх ахвотных спартыўнай і культурнай праграмай II Еўрапейскіх гульняў, гідам балельшчыка, турыстычнай картай горада і буклетамі пра славутасці Мінска і Беларусі.

Усяго на аказанні інфармацыйных паслуг будзе задзейнічана больш як 600 добраахвотнікаў. На гарадскіх інфапунктах размесцяцца 200 чалавек. І каля 400 валанцёраў будуць дапамагаць гледачам і балельшчыкам прайсці на трыбуны, каб пазбегнуць утварэння вялікіх чэргаў.

Карта размяшчэння інфармацыйных пунктаў даступная на сайце II Еўрапейскіх гульняў.

БДУ з'яўляецца афіцыйным партнёрам міжнародных спаборніцтваў і мае адну з самых прадстаўнічых дэлегацый валанцёраў на гульнях у колькасці больш чым 1700 чалавек.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Прэзідэнцкія выбары ў Літве выйграў Гітанас Наўседа



У другім туры прэзідэнцкіх выбараў у Літве перамог незалежны кандыдат Гітанас Наўседа з вынікам у 65,86 працэнта галасоў выбаршчыкаў. Пра гэта сведчаць вынікова звесткі Цэнтральнай выбарчай камісіі краіны. Наўседа — эканаміст і раней уваходзіў у праўленне Банка Літвы, у палітыку прыйшоў з прыватнага банкаўскага сектара. Афіцыйна ён не звязаны ні з адной партыяй і з'яўляецца прыхільнікам ліберальнай мадэлі эканомікі. Ягоная саперніца ў другім туры Інгрыда Шымоне — экс-міністр фінансаў, дэпутат Сейма, кандыдат ад кансерватыўнай партыі «Саюз Айчыны — Хрысціянскія дэмакраты Літвы», — набрала 32,86 % галасоў. Партыя «Саюз Айчыны — Хрысціянскія дэмакраты Літвы» ў свой час ускосна падтрымлівала дзеючага прэзідэнта Літвы Далю Грыбаўскайтэ. Яўка ў другім туры прэзідэнцкіх выбараў склала амаль 52,49 працэнта, прычым што за апошнія 15 гадоў яна не падымалася вышэй за 52 %. Каля 10 працэнтаў грамадзян з правам голасу прагаласавалі датэрмінова.

### Нарэндра Модзі ўзначаліў індыйскі ўрад другі раз запар



Прэзідэнт Індыі Рам Натх Ковінд прызначыў лідара «Бхаратыя джаната парці» (БДП) Нарэндру Модзі прэм'ер-міністрам. Пра гэта паведамляецца на старонцы прэзідэнта Індыі ў Twitter. Прэзідэнт сустрэўся з Модзі і папрасіў яго сфарміраваць новы ўрад краіны і прадставіць яму спіс чэнаў кабінета міністраў. Пасля сустрэчы прэм'ер звярнуўся да прэсы. «У найбліжэйшыя дні ўрад пачне працаваць. Мы спадзяёмся, што ні адна секунда не знікне дарма», — сказаў Модзі, выступленне якога транслявалі індыйскія тэлеканалы. Раней ён быў абраны лідарам кіруючага «Нацыянальна-дэмакратычнага альянсу», што дазволіла другі раз запар заняць пасаду прэм'ер-міністра. «Бхаратыя джаната парці» атрымала 303 месцы ў Лок Сабха (ніжняй палаце парламента), якая складаецца з 543 дэпутатаў. У краіне завяршыўся працэс парламенцкіх выбараў, што працягваўся больш за месяц. Галасаванне ва ўсіх 29 штатах і на сямі саюзных тэрыторыях расцягнулася на сем этапаў, першы з якіх прайшоў 11 красавіка. Вядучая апазіцыйная партыя «Індыйскі нацыянальны кангрэс» (ІНК) атрымала 52 месцы. Паводле ацэнак палітолагаў, БДП разам з саюзнікамі, якія ўтвараюць «Нацыянальны дэмакратычны альянс», могуць у суме атрымаць каля 350 месцаў. А ІНК з саюзнікамі (якія ўтвараюць апазіцыйны «Аб'яднаны прагрэсіўны альянс») можа атрымаць толькі каля 90 месцаў.

### На Канскім фестывалі перамог «Паразіт»



«Залатую пальмавую галіну» 72-га Канскага кінафестывалю атрымаў фільм «Паразіт» паўднёвакарэйскага рэжысёра Пон Чжун Хо. Гэта своеасаблівая сатыра на супрацьстаянне багатых і бедных, але ў той жа час і крымінальны трылер, і чорная камедыя. Стужка расказвае пра бедную карэйскую сям'ю, якая спрабуе за кошт іншых палепшыць сваё фінансавае становішча. Другую па значнасці прэмію, Гран-пры, атрымаў фільм «Атлантыка» Маці Дыёп. Яна стала першай цемнаскурай жанчынай-лаўрэатам за ўсе гады фестывалю. «Атлантыка» — дэбютны поўнаметражны фільм Дыёп. Эмілі Бічэм стала лепшай актрысай за ролю ў карціне «Малыш Джо» Джэсікі Хаўснер. Антонія Бандэрас прызнаны лепшым акцёрам за ролю ў псіхалагічнай драме «Боль і слава» Педра Альмадовара. Бандэрас сыграў у ёй рэжысёра, які азіраецца на сваё жыццё і творчасць у пачуццём пустаты ад немагчымасці працаваць далей. Бельгійскія рэжысёры Жан-П'ер і Люк Дардэны атрымалі прыз за найлепшую рэжысуру. У конкурсе яны ўдзельнічалі з драмай «Малады Ахмед». У гэтай карціне рэжысёры звяртаюцца да тэмы ісламскага радыкалізму.

# «ЗВЯЗДА» — СЯРОД УЗНАГАРОДЖАНЫХ

**Юбілейныя, 15-я, спаборніцтвы за прыз імя У. Спасовіча — статутку, што ўвасабляе сабой законнасць і літаратурны талент, — аб'ядналі прававой тэматыкай юрыстаў, журналістаў, адвакатаў, студэнтаў, навукоўцаў і іншых аўтараў.**

На 11 намінацый конкурсу, які ладзіць Міністэрства юстыцыі, даслана больш за 100 работ, большасць з якіх прыйшлася на катэгорыю «Натарыят».

Уручаючы ўзнагароды журналістам, **Уладзімір ЖАЎНЯК, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта,** заўважыў, што ён цяпер ведае, «дзе браць кадры для ідэалагічнай «вертыкалі», і дадаў, што «журналісты і юрысты аднолькава могуць разбалансаваць і ўзарваць грамадскае меркаванне».




А **міністр юстыцыі Алег СЛІЖЭЎСКІ** падзякаваў усім прысутным і запэўніў, што «гэтага конкурсу не было б, калі б не аўтары».

Сёлета адным з дыпламантаў конкурсу ў намінацыі «Права і журналістыка» ўжо не першы раз стала **спецыяльны карэспандэнт «Звязды» Ірына СІДАРОК.**

***Віншуем калегу і жадаем новых творчых поспехаў!***

# ЦІ «СКОКНУЛА» АРЭНДА ПЕРАД ГУЛЬНЯМІ?

## Кватарант — уласнік: як зразумець адно аднаго?

Па словах спадарыні Пачыцкай, найбольш тыповы запыт на арэнду гучыць як «аднапакаёвая кватэра, каля метро, у добрым стане і нядорага». Пры гэтым паняцце «ў добрым стане» ў арандатараў і ўласнікаў часта значыць рознае. Напрыклад, кватарант хоча ўбачыць унутры кватэры хай просты і недарагі, але сучасны рамонт. Ён хоча жыць з мінімальным наборам мэблі: кухняй са сталом і крэсламі, канапай на два паўнавартасныя спальныя месцы і як мінімум адной шафай. Акрамя таго, у кватэры павінен быць мінімальны набор хоць бы новай бытавой тэхнікі, прадстаўлены халадзільнікам, пральнай машынай, электрачайнікам і мікрахвалёўкай.

Але супярэчнасць у тым, што кватэры ў акуратным і сучасным стане з падобнай укамплектаванасцю мэбляй і бытавой тэхнікай, ды яшчэ і побач з метро, гаспадарамі ацэньваюцца інакш, чым арандатарамі — значна даражэй.

Напрыклад, мінімальная цана ад здавання ў арэнду аднапакаёвай кватэры роўная 180 доларaў у месяц. Як правіла, гэта будзе альбо кватэра ў аддаленым раёне Мінска (такім, як Шабаны), альбо зусім у прыгарадзе Мінска — напрыклад, Соснах, Прывольным, Сокале ды іншых пунктах. Тэарэтычна за гэтыя грошы можна паспрабаваць знайсці варыянты і ў межах МКАД, але іх стан, хутчэй за ўсё, будзе далёка не найлепшы, у той час як у Соснах за гэтыя грошы прапануюцца акуратныя і ўкамплектаваныя кватэры. А, напрыклад, у Фаніпалі за 170 доларaў можна арандаваць аднапакаёвую кватэру ў новабудоўлі, са свежым рамонтам і мэбляй.

## Цэны выраслі, за якасць — удвая больш

Калі ж прынцыпова шукаецца аднапакаёвая кватэра ў Мінску і ў добрым стане, то варта быць гатовым да кошту ад 220 доларaў у месяц. Але нават за гэтыя грошы арандатар наўрад ці атрымае кватэру з сучасным рамонтам і мікрахвалёўкай — найхутчэй за ўсё гэта будзе фармат «дагледжанага жылля з мінулага стагоддзя». Калі свежасць рамонту і бытавая тэхніка прынцыповая, то цана вырастае не менш чым да 250 доларaў. Калі дадаць да гэтага яшчэ і метро ў крокавай даступнасці, то менш чым на 280 «зялёных» наўрад ці варта разлічваць. Пры набліжэнні да цэнтра горада гэтая цана будзе толькі павялічвацца. У цэнтры мінімальная цана маленькіх кватэр набліжаецца да 300—350 доларaў за месяц. І гэта зусім не мяжа.

Двухпакаёвыя кватэры карыстаюцца попытам у асноўным сярод сямейных кватарантаў з дзецьмі. Хтосьці шукае кватэру без мэблі, але з акуратным рамонтам, а хтосьці гатовы заехаць толькі ў выпадку «поўнага камплекта». Суадносіны падобных запытаў прыкладна 50 на 50. Мінімальны кошт «двушак» у Мінску — каля 250 доларaў у месяц. За гэтую цану можна разлічваць на кватэру без глянцу сучаснасці, якая знаходзіцца ў аддаленым раёне горада і не мае мэблі. Хоць бываюць і выключэнні — калі гаспадары не ганяюцца за цаной, а хочуць здаць кватэру ў арэнду прыстойнай сямейнай пары на працяглы тэрмін.

Сярэдняя цана арэнды сучасных і ўкамплектаваных мэбляй і бытавой тэхнікай двухпакаёвых кватэр знаходзіцца на ўзроўні бліжэй да 300 доларaў. Усё залежыць ад якасці рамонту і складу мэблі і бытавой тэхнікі. Блізкасць да метро дадае да цаны яшчэ 30—50 доларaў.

Трохпакаёвыя кватэры карыстаюцца значна меншым попытам, чым адна- і двухпакаёўкі. Больш за тое, нярэдкія выпадкі, калі трохпакаёўку адмаўляюцца арандаваць нават па цане «двушак». Прычына ў высокім кошце камунальных паслуг. Таму мінімальная цана арэнды шматпакаёвага жылля цалкам можа быць на ўзроўні двухпакаёвай кватэры.

Для арандатараў важнае значэнне мае, ці зарэгістраваны ў кватэры хто-небудзь, бо ад гэтага залежыць велічыня камунальных плацяжоў. Прычым розніца плацяжоў можа быць двухразовай і нават большай. Напрыклад, калі ў аднапакаёвай кватэры ёсць зарэгістраваныя, то сума камунальных плацяжоў без уліку электрычнасці складае каля 35 рублёў. А вось калі кватэра «пустая», то плацяжы могуць дасягаць 100 рублёў і больш. У выніку гэтага часцяком кватэры, у якіх ніхто не зарэгістраваны, здаюцца ў арэнду танней — каб кампенсаваць арандатарам розніцу ў «камуналцы». Таму калі вы знаходзіце сімпатычную кватэру па цане ніжэй за рынкавую, то пацікаўцеся наяўнасці зарэгістраваных у ёй людзей.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



## Гульні тут ні пры чым

Чаму цана арэнды вырасла і ці працягвае яна расці і цяпер? На думку нашага эксперта, прычына падаражэння арэнды ў памяншэнні колькасці кватэр стандартных спажывецкіх якасцяў, або так званага эканом Сегмента. У апошнія гады стала здавацца ў арэнду прыкметна менш новых кватэр. Асабліва гэта заўважна ў параўнанні з 2012—2013 гадамі, калі на рынак у вялікай колькасці выходзілі кватэры ў новабудоўлях мікрараёна Каменная Горка.

Цяпер новыя кватэры таксама з'яўляюцца, але зусім у іншай колькасці. Напрыклад, з Новай Баравой. Але там агульны ўзровень якасці зусім іншы — як правіла, такія кватэры здаюцца ўжо гатовымі да пражывання: з мэбляй і тэхнікай. Таму, адпаведна, і цана высокая.

Кватэр з бюджэтным цэннікам робіцца менш і таму, што гаспадары кватэр паблізу метро лічаць, што месцазнаходжанне ўсё вырашае, і ўжо на падставе гэтага ўстанаўліваюць высокую цану. Пры гэтым якаснага рамонту можа і не быць. Альбо адваротная сітуацыя — уласнікі робяць дарагі рамонт у надзеі, што змогуць высокай цаной арэнды яго апраўдаць. Тэарэтычна гэта магчыма, але тады кватэра павінна знаходзіцца ў новым сучасным доме з такімі атрыбутамі, як абгароджаная тэрыторыя, відэаназіранне і многае іншае.

Што датычыцца ўплыву Еўрапейскіх гульняў, то наш эксперт да гэтай прычыны павелічэння кошту арэнды ставіцца скептычна і з усмешкай. Хоць і прызнае, што некаторыя ўласнікі сапраўды разглядаюць гэтую падзею ў якасці падставы для ўзняцця цэн. Накошт устанаўлення цаны арэнды існуе адно даказанае на практыцы правіла: нават калі і знойдзецца кліент, якога задаволіць відавочна завышаная цана — то не варта радавацца. У большасці выпадкаў падобныя кватаранты з'язджаюць з кватэры, як толькі знойдуць варыянт з адэкватным рынку коштам, і таму ставяцца да кватэры як да вымушанага перавалачнага пункта.

Да канца года яшчэ большага павелічэння кошту арэнды, на думку экспертаў рынку, чакаць не варта. Зрэшты, як і зніжэння. Што датычыцца Еўрапейскіх гульняў, то скасоўваць існуючыя дагаворы арэнды дзеля заўзятараў і турыстаў наш эксперт не раіць: вялікая рызыка страціць тое, што ўжо ёсць. Але калі кватэра цяпер без кватарантаў — тады чаму б і не паспрабаваць. І пачынаць пошук кліентаў можна ўжо цяпер. Бо заяўкі на пошук кватэры ў арэнду ад ахвотных наведаць Еўрапейскія гульні ўжо паступаюць.

**Сяргей КУРКАЧ.**



**Извещение о проведении 90-го открытого аукциона по продаже земельных участков в Солигорском районе 1 июля 2019 г.**

| № лота | 1 | 2 | 3 |
|---|---|---|---|
| Предмет аукциона | право заключения договора аренды земельного участка | | |
| Адрес земельного участка | **Солигорский р-н, Чижевичский с/с, п. Чижовка, ул. Центральная, 23А** | **Солигорский р-н, Зажевичский с/с, аг. Зажевичи, ул. Школьная, 27** | **Солигорский р-н, г. п. Старобин, ул. Коржа, 13** |
| Кадастровый номер | 625085412601000483 | 625081701601000925 | 625056200001001990 |
| Площадь, га | 0,2226 | 0,1520 | 0,0911 |
| Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества (целевое назначение) | размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома) | размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома) | размещение объектов розничной торговли (строительство и обслуживание торгового павильона) |
| Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории* | имеется подъезд с асфальто-бетонным покрытием, возможность подключения к сетям электроснабжения, газоснабжения и связи | имеется подъезд с песчано-гравийным покрытием, возможность подключения к сетям электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения, связи | имеется транспортная и инженерная инфраструктура |
| Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений | земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, – 0,0143 га | земельный участок, расположенный в охранных зонах электрических сетей, – 0,0017 га | земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, – 0,0157 га |
| Начальная цена продажи, руб. | 1 365,12 | 1 306,04 | 4 845,75 |
| Сумма задатка, руб. | 273,00 | 261,00 | 969,00 |
| Срок аренды земельного участка / условия продажи | 30 лет / см. пункт 6 | 30 лет / см. пункт 6 | 20 лет / см. пункт 6 |
| Затраты на организацию и проведение аукциона, руб. | 2 492,81 | 2 341,62 | 3 732,99 |
| | + затраты на объявление в СМИ | | |

| № лота | 4 | 5 |
|---|---|---|
| Предмет аукциона | право заключения договора аренды земельного участка | |
| Адрес земельного участка | **Солигорский р-н, г. Солигорск по ул. Строителей** | **Солигорский р-н, Старобинский с/с, д. Поварчицы, по ул. Советская** |
| Кадастровый номер | 625050100001003063 | 625086202101000352 |
| Площадь, га | 0,2609 | 0,0742 |
| Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества (целевое назначение) | размещение объектов многоквартирной жилой застройки (строительство и обслуживание многоквартирного жилого дома повышенной комфортности) | размещение объектов розничной торговли (строительство и обслуживание магазина) |
| Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории* | имеется транспортная и инженерная инфраструктура | имеются асфальтированные подъездные пути, возможность подключения к сетям электроснабжения, газоснабжения и связи |
| Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений | земельные участки, расположенные в охранных зонах сетей и сооружений теплоснабжения – 0,0272 га, линий связи и радиофикации – 0,0197 га, электрических сетей – 0,0015 га, объектов газораспределительной системы – 0,0423 га | земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации, – 0,0036 га |
| Начальная цена продажи, руб. | 43 978,66 | 212,54 |
| Сумма задатка, руб. | 8 795,00 | 42,00 |
| Срок аренды земельного участка / условия продажи | 10 лет / 1. после ввода объекта в эксплуатацию безвозмездно передать в собственность Солигорского района жилые помещения в количестве 10 процентов общей площади (на основании подпункта 1.5. пункта 1 решения Минского облисполкома от 14 ноября 2014 г. № 978); 2. см. пункт 6 | 20 лет / см. пункт 6 |
| Затраты на организацию и проведение аукциона, руб. | 3 072,84 | 3 345,40 |
| | + затраты на объявление в СМИ | |

*в разделе указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте.

Продавец: Солигорский районный исполнительный комитет (далее – райисполком), 223710, г. Солигорск, ул. Козлова, 35.

Порядок проведения аукциона и порядок оформления участия в торгах определяются Гражданским кодексом Республики Беларусь, Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

1. Аукцион состоится в 15.00 1 июля 2019 г. по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 35, зал заседаний райисполкома.

І хаця сітуацыя са станам кругласутачных летнікаў у асноўным стабільная, іх не хапае. Для жыхароў Гродна дзейнічаюць аздараўленчыя ўстановы каля горада, але іх усяго дзве. Каб зняць ажыятаж і задаволіць попыт на такі адпачынак, юныя гараджане сёлета ўпершыню паедуць на аздараўленне ў іншыя раёны вобласці, у прыватнасці Зэльвенскі і Бераставіцкі.

Таксама ў рэгіёне пачалі адкрываць кругласутачныя летнікі на базе школ у экалагічна чыстых зонах. Навінка сезона — скарочаныя 9-дзённыя змены.

— Гэта першы вопыт у рэспубліцы, — кажа Таццяна Асмалоўская. — І ён паказаў, што гэта запатрабавана. Гарадскія дзеці едуць у сельскія школы і там праходзяць аздараўленне. Сёлета, напрыклад, так адпачнуць 1200 гараджан. Гэта арганізаваны групы, якія едуць са сваімі педагогамі. Напрыклад, у Мастоўскай гімназіі сёлета будзе летнік ужо другі сезон.

Як паведаміў **начальнік Гродзенскага абласнога ўпраўлення рэспубліканскага цэнтра па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні Анатоль ГАНЧАР,** у кругласутачныя летнікі пуцёўкі выдаюцца бацькам па месцы працы. Заявы падаюцца ў камісіі па аздараўленні, якія, у сваю чаргу, звяртаюцца да ўласнікаў такіх устаноў. Там, дзе няма адпаведных камісій, напрыклад у індывідуальных прадпрымальнікаў, можна звярнуцца да ўласнікаў наўпрост, зарэзерваваць месца, а затым паведаміць спецыялістам па аздараўленні па месцы жыхарства.

Агульны кошт пуцёўкі складае 400 рублёў, палову аплачвае бюджэт. Астатнюю частку — альбо самі бацькі, альбо прадпрыемства. Сёлета з абласнога бюджэту на аздараўленне дзяцей выдаткавана сем мільёнаў рублёў, што больш, чым у мінулым годзе, на 700 тысяч. Пры гэтым кожны школьнік можа выкарыстаць датацыю двойчы: адзін раз у кругласутачным летніку, другі — у прышкольным. Некаторыя катэгорыі дзяцей маюць дадатковыя льготы.

## Летнік з акцэнтам

Паколькі планка ўзнята даволі высокая — аздаравіць усіх, хто пажадае, — асноўная нагрузка прыпадае на прышкольныя летнікі. На такі адпачынак больш накіраваны бацькі малодшых школьнікаў, але і старэйшым таксама ёсць чым заняцца. Цікавы вопыт у гэтым кірунку мае Гродзенскі раён, дзе знаходзіцца максімальная колькасць усіх відаў летнікаў. Тут упершыню будзе арганізаваны адпачынак у кадэцкім вучылішчы. Напачатку для будучых кадэтаў, затым для адораных школьнікаў пачне працаваць змена «Навука».

Папулярныя сярод школьнікаў перасоўвачныя турыстычныя летнікі. У раённым дзіцячым цэнтры творчасці распрацавана некалькі маршрутаў — для аматараў горнага турызму, веласіпедыстаў, з навыкамі арыентавання і скалалазання.

Для тых, хто марыць звязаць свой лёс з пагранічнай службай, працуе летнік «Алмаз» на базе пагранзаставы.

Экалагічны атрад «прапісаўся» ў Індурскім школьным лясніцтве. На летніх канікулах школьнікі адпачываюць, працуюць і займаюцца навуковымі даследаваннямі. Іх навуковыя работы па ліквідацыі наступстваў забруджвання лясоў і вадаёмаў атрымалі прызы на абласных і рэспубліканскіх конкурсах. У летніку школьнікі могуць нядрэнна зарабіць — па 100 рублёў за 18 дзён.

— Наша ноу-хау — гэта новыя профілі, — адзначае Таццяна Асмалоўская. — Упершыню сёлета адкрываем летнік для аграрных класаў. Паколькі такія класы ёсць толькі ў райцэнтрах, мы збіраем навучэнцаў у Гродне. Кругласутачны летнік арганізаваны на базе інстытута развіцця адукацыі. У ім будуць сумяшчацца прафарыентацыя і аздараўленне.

Праграма распрацавана з аграрным універсітэтам, у яе ўключана наведванне лабараторый, запланаваны экскурсіі на прадпрыемствы.

Ёсць намер аздаравіць у рэгіёне 63 тысячы школьнікаў, гэта больш за палову ад усёй колькасці навучэнцаў. Шырокаму ахопу спрыяюць дадатковыя сродкі. Напрыклад, Гродзенскі раён атрымаў спонсарскую дапамогу ў памеры 60 тысяч рублёў. Гэта столькі, колькі выдаткаваў бюджэт. Уласнікі летнікаў зарабляюць у міжсезонны перыяд — здаюць у арэнду сталовыя, спальныя карпусы. Напрыклад, на базе лідскіх аздараўленчых летнікаў праводзіцца злёт байкераў. На некаторых працуюць навагоднія рэзідэнцыі. Гэта дапамагае развіваць аздараўленчую базу. Сёлета са сродкаў рэспубліканскага суботніка вобласць атрымала на летнюю кампанію 250 тысяч рублёў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Будзьце пільныя!

## Канікулы яшчэ не пачаліся, а трагедыі ўжо здараюцца

### У мінулую нядзелю ў Клімавіцкім раёне патанулі на вадаёмах трое дзяцей

**Аб гэтым паведамляе БелТА са спасылкай на старшыню Магілёўскай абласной арганізацыі таварыства выратавання на водах Мікалая Майсеева.**

Першы інцыдэнт адбыўся на вадасховішчы ў вёсцы Собалеўка Раднянскага сельсавета. Мяркуецца, што два браты гулялі каля дамбы, паслізнуліся і ўпалі ў ваду. Пасля званка мінака на месца здарэння прыехалі ратавальнікі, якія знайшлі на беразе вадасховішча нежывога малога. Яго дасталі з вады мясцовыя жыхары. Па іх словах, у вадасховішчы мог знаходзіцца і яго брат. У выніку пошукаў вадалазы дасталі з вады цела старэйшага 11-гадовага брата (ён знаходзіўся на глыбіні чатырох метраў за 5—7 метраў ад берага). Абодва хлопчыкі жылі ў вёсцы Собалеўка.

Яшчэ адна трагедыя здарылася ў гэты ж дзень у крэйдавым кар'еры каля саміх Клімавіч. Па словах відавочцаў, дзяўчынка гуляла па вадзе каля самага берага і раптам апынулася пад вадой. Яе выцягнулі мясцовыя жыхары, што адпачывалі непадалёк, аднак выратаваць падлетка 2005 года нараджэння не ўдалося.

— У абодвух выпадках дзеці знаходзіліся без нагляду бацькоў і ў не ўстаноўленых афіцыйна месцах для адпачынку. Таксама на вадаёмах адсутнічалі таблічкі аб забароне купання, што і стала адной з галоўных прычын трагедый, — лічыць Мікалай Майсееў. — Для нас гэта таксама чорная нядзеля: такіх выпадкаў, каб за адзін дзень загінулі адразу трое непаўналетніх, у раёне даўно не было.

Па словах старшыні таварыства выратавання на водах, у вобласці плануецца актывізаваць работу па прафілактыцы няшчасных выпадкаў на вадзе з наведваннем устаноў адукацыі, працоўных калектываў, арганізацый выступленняў у мясцовых СМІ.


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО РУП «БРЕСТСКОЕ ОТДЕЛЕНИЕ БЕЛОРУССКОЙ ЖЕЛЕЗНОЙ ДОРОГИ» БРЕСТСКАЯ ДИСТАНЦИЯ ГРАЖДАНСКИХ СООРУЖЕНИЙ**

| Наименование и местоположение объекта | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. | Общая площадь, кв. м | Арендная плата, баз. ар. вел. |
|---|---|---|---|---|
| ЛОТ № 1. Помещения, пл. 347,7 кв. м, расположенные в капитальном строении с инв. № 130/С-26637 (наименование – здание бытовых помещений; назначение – здание административно-хозяйственное), расположенное по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Железнодорожная, д. 21А | 1 469,03 | 146,90 | 347,7 | 132,13 |

| | |
|---|---|
| Условия | 1. Срок аренды — 3 (три) года.<br>2. С победителем аукционных торгов в течение 10 (десяти) рабочих дней будет заключен договор аренды.<br>3. Стоимость права заключения договора аренды должна быть выплачена продавцу в течение 3 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона за вычетом задатка.<br>4. Возместить Организатору аукционных торгов расходы по их проведению в течение 3 раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.<br>5. Назначение использования: размещение офиса; организация розничной торговли промышленными и продовольственными товарами за исключением взрывоопасных, легковоспламеняющихся; хранение продовольственных и непродовольственных товаров за исключением взрывоопасных, легковоспламеняющихся; оказание услуг связи; оказание страховых услуг; организация общественного питания |
| Реквизиты для перечисления задатка | РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал, р/с BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк». Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича,10 , BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245 |

**Аукцион состоится 11 июня 2019 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, и иную информацию можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81

Размер штрафных санкций, предусмотренных Указом Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 (в ред. Указов Президента Республики Беларусь от 11.12.2009 г. № 624, от 23.09.2011 г. № 431, от 10.01.2013 г. № 14) — 10 базовых величин

**Последний день приема заявлений — 10 июня 2019 г. до 17.00**

Ранее извещение об проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 03.04.2019 г.


Не сезон

## Уводзіцца забарона на вылаў сома

**У чатырох абласцях краіны — Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай — з 31 мая ўстанаўліваецца забарона на вылаў сома ў сувязі з яго нерастам. Яна будзе дзейнічаць да 1 ліпеня. У рыбалоўных угоддзях Брэсцкай і Гомельскай абласцей аналагічная забарона пачала дзейнічаць з 19 мая і будзе ў сіле да 20 чэрвеня.**

Сом нерастуе пазней за іншых рыб, пры прагрэве вады да 18 градусаў, нагадалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Забарона на яго вылаў падчас нерасту з'яўляецца адной з мер аховы гэтага некалі чырванакніжнага віду.

Незаконная здабыча адной асобіны сома падчас забароны абыдзецца парушальнікам у 12 базавых велічынь (306 рублёў). Апроч таго, на іх будзе накладзены адміністрацыйны штраф — да 50 базавых велічынь.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



# ГОМЕЛЬСКІ РАЁН — ТЭРЫТОРЫЯ РЭАЛІЗАЦЫІ ВЫТВОРЧАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ

## Раён — адзін з найбольш густанаселеных у Гомельскай вобласці, сэрца паўднёва-ўсходняга беларускага Палесся. А яшчэ — уязныя вароты ў абласны цэнтр

**— Па стане тэрыторыі і аб'ектаў, што знаходзяцца тут, ствараецца першае ўражанне пра ўсю вобласць і нават краіну, — адзначае старшыня Гомельскага райвыканкама Алена АЛЕКСІНА. — Таму мы робім усё, каб ўражанне ад Гомельскага раёна было станоўчае.**



Гародніну і мясныя вырабы з дзесяці сельгаспрадпрыемстваў раёна ўжываюць жыхары горада Гомеля. Значную долю — амаль 15 % — раён уносіць ва ўдзельную вагу агульнай вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі ўсёй вобласці, адзначае Алена Іванаўна:

— Нашы сельгаспрадпрыемствы прадстаўляюць самыя разнастайныя кірункі. Дзве птушкафабрыкі — Гомельская і «Рассвет» — займаюцца вытворчасцю яек і мяса курэй-бройлераў. Ёсць тры буйныя свінагадоўчыя комплексы. Тры гаспадаркі раёна спецыялізуюцца на вырошчванні разнастайнай гародніны: КСУП «Цяплічнае», КСУП «Брылёва» і ААТ «Усход». Апошнія дзве маюць вытворчасці для перапрацоўкі сваёй прадукцыі. На «Усходзе» таксама вырошчваюць авечак. Іх статак складае 2,5 тысячы галоў. Там жа займаюцца рыбай і грыбамі шыітаке. Дарэчы, нашы агародніцкія прадпрыемствы — асноўныя пастаўшчыкі стабілізацыйнага фонду на зімовы перыяд для ўстаноў сацыяльнай сферы Гомеля.

Прамысловасць у сельскагаспадарчым раёне прадстаўлена некалькімі прадпрыемствамі, сярод якіх можна вызначыць ААТ «Завод тарфяного машынабудавання «Бальшавік», ТАА «Вытворчая кампанія «Сябры», ТАА «Кандытарская фабрыка «Летаж», вытворчасць абсталявання для даення ААТ «Гомельагракамплект», ААТ «Гомельскі завод «Імпульс», ААТ «Гомельскі бялкова-тлушчавы завод» і некаторыя іншыя.

— Раён вакол абласнога цэнтра — прывабная тэрыторыя для бізнесу, — працягвае Алена Алексіна. — Таму ў нас развіта прадпрымальніцтва. На тэрыторыі знаходзіцца звыш 1800 суб'ектаў малога і сярэдняга бізнесу і 1240 індывідуальных прадпрымальнікаў. Сёлета стаіць задача стварэння 39 новых вытворчасцяў. За першы квартал 10 ужо створана. У нас ёсць 25 інтэрнэт-крам. Прычым дзевяць з іх зарэгістраваныя летась. Яшчэ наш раён — гэта курортная зона. Сёння тут дзейнічаюць тры здраўніцы: санаторыі «Чонкі», «Машынабудаўнік» і «Залатыя пяскі». Тут з задавальненнем адпачываюць не толькі жыхары нашай краіны, але і замежнікі. Здраўніцы маюць сучаснае абсталяванне як лячэбна-аздараўленчае, так і прызначанае для касметычных працэдур. Таксама на нашай тэрыторыі знаходзіцца некалькі дзіцячых аздараўленчых лагераў.

Эфектыўнасць работы ўсіх прадпрыемстваў і арганізацый і забеспячэнне выканання прагнозных паказчыкаў — вось асноўныя задачы, якія стаяць перад Гомельскім раёнам. Сёлета ў раёне плануюць пабудаваць пяць станцый абезжалезвання вады. Такім чынам, часткова знімецца праблема з яе якасцю. Увогуле ж, за гэты год тут павінны пабудаваць 39 тысяч квадратных метраў жылля. І большасць (30 тысяч) складзе індывідуальная забудова. За першы квартал года ўжо ўведзена ў эксплуатацыю 9 960 квадратных метраў жылых дамоў — гэта 25 % выканання гадавога задання. Зразумела, самыя запатрабаваныя тэрыторыі, блізкія да абласнога цэнтра. Гэта Чонкі, Сеўрукі, Краснае, Бальшавік... Дарэчы, у апошнім населеным пункце будзе сёлета здадзены першы эксперыментальны дом з электракацельнай. У сувязі з масавым будаўніцтвам ёсць і праблемы: не хапае месцаў у выхаваўчых і адукацыйных установах. У Чонках, дзе знаходзіцца аздараўленчы лагер, адно з памяшканняў будзе рэканструявацца пад дзіцячы садок.

— Сёлета пачынаем рэалізацыю рэспубліканскага праекта «Вёска будучыні» — у аграгарадках Мічурынская і Бабовічы, — гаворыць старшыня райвыканкама. — Нядаўна жыхары апошняга папрасілі ўсталяваць месцы для гандлю. Цяпер за сродкі, выручаныя падчас суботніка, будзем займацца гэтай справай. Вельмі хутка ў нашым раёне развіваецца гандлёвае абслугоўванне. Мы невыпадкова займаем трэцяе месца па тавараабароце ў вобласці і першае месца па тавараабароце грамадскага харчавання. Цяпер шукаем інвестара, якому будуць цікавыя нашы праекты: у ААТ «Усход» хацелі б рэалізаваць праект па ўсталёўцы сонечных батарэй. Там жа можна было б арганізаваць вытворчасць бульбяных чыпсаў. Такія праекты-прапановы мы прадстаўлялі на XVI Гомельскім эканамічным форуме. Увогуле ж, туды мы падалі пяць прапаноў. Сярод іх — і гандлёвы аб'ект грамадскага харчавання ў Чонках, і будаўніцтва аўтастаянкі ў пункце мытнага пропуску Новая Гута. У нашым раёне добра развітая інфраструктура, высокі ўзровень адукацыі і прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў. Таму мы павінны надалей развіваць і цалкам выкарыстоўваць гэты патэнцыял.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

*** У раёне стала пражывае 68,3 тысячы чалавек. На тэрыторыі знаходзіцца 334 садоўніцкія таварыствы — гэта больш чым 28 тысяч зямельных участкаў. Колькасць насельніцтва ў Гомельскім раёне значна павялічваецца ў летні сезон.**

*** Праз тэрыторыю раёна праходзяць аўтамагістралі на Кіеў, Бранск, Санкт-Пецярбург, у тым ліку аўтадарогі рэспубліканскага значэння М-5, М-8, М-10. Акрамя таго, на тэрыторыі раёна размешчаны аэрапорт з міжнародным статусам.**

*** ААТ «Сцяг Радзімы» занесена на рэспубліканскую і абласную дошкі пашаны, КСУП «Урыцкае» па выніках мінулага года — на абласную дошку пашаны.**

*** Мінулы год прынёс у скарбонку Гомельскага раёна два сярэбраныя і два бронзавыя медалі з чэмпіянатаў свету і Еўропы. У студзені — сакавіку 2019 года былі заваяваны адна сярэбраная і тры бронзавыя медалі на першынствах Еўропы.**



*** Самы стары помнік гісторыка-культурнай спадчыны Гомельскага раёна — Свята-Мікалаеўская царква ў вёсцы Старая Беліца. Гэта помнік архітэктуры драўлянага дойлідства з элементамі барока. Датуецца прыкладна 1710 ці 1777 гадамі.**

# ФІРМЕННЫ ГАНДАЛЬ БУДЗЕ ПАШЫРАНЫ

**ААТ «Агракамбінат «Паўднёвы» — адно з самых буйных у Рэспубліцы Беларусь прадпрыемстваў па вытворчасці свініны. Пагалоўе свіней тут складае каля 30 тысяч. Гаспадарка была створана ў 1973 годзе. Сёння высокатэхналагічнае шматпрофільнае аграпрамысловае прадпрыемства стабільна развіваецца і займае вядучае месца не толькі ў сваім рэгіёне, але і ў цэлым па краіне.**

Жывёлагадоўля цяпер прадстаўлена комплексам па гадаванні свіней на прамысловай аснове, рэпрадуктарнай і адкормачнай фермамі, малочнатаварнымі фермамі і фермай па гадаванні рамонтнага маладняка буйной рагатай жывёлы. У агракамбінаце займаюцца вытворчасцю малака і ялавічыны. Таксама дзейнічаюць машынна-трактарныя паркі, сталовыя, цэхі: забойны, па перапрацоўцы мяса, насення алейных культур, па вытворчасці пелет і брыкетаў.



— Летась было атрымана 4706 тон свіной прадукцыі — амаль на 6 % больш, чым у папярэднім годзе, — адзначае **выконваючы абавязкі дырэктара Мікалай МІСАЧЭНКА.** — Выкананне дасягнута за кошт росту сярэднясутачнага прыбаўлення ў вазе на 19 грамаў да ўзроўню 2017 года. Павялічылася і рэалізацыя прадукцыі. Тэмп яе росту склаў 108,3 %. На 7,6 % больш было выраблена мяса, а рэнтабельнасць склала 17,2 %.

Цэх па вытворчасці мяса свініны на прадпрыемстве быў адкрыты 16 гадоў таму. Першапачаткова ў ім перапрацоўвалася толькі 35 % свініны ўласнай вытворчасці, сёння — практычна ўся. Тут выпускаецца звыш 170 найменняў разнастайнай смачнай прадукцыі. Дарэчы, рэнтабельнасць цэха перапрацоўкі ў справаздачным годзе склала 15,7 %. Цяпер перад камбінатам стаіць задача па нарошчванні аб'ёмаў перапрацоўкі свініны ва ўласным цэху, што пацягне далейшае павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці і рэалізацыі гатовай прадукцыі.

На прадпрыемстве пастаянна вядзецца работа па паляпшэнні якасці і асартыменту прадукцыі. Самыя свежыя паўфабрыкаты, каўбасныя вырабы, вэнджаніну можна набыць у крамах фірменнай гандлёвай сеткі ААТ «Агракамбінат «Паўднёвы». 20 буйных і невялікіх гандлёвых пунктаў знаходзяцца на рынках Гомеля і Буда-Кашалёва.

Для павелічэння аб'ёмаў рэалізацыі праз уласны фірменны гандаль нядаўна была адкрыта крама № 6 у аграгарадку Пакалюбічы, таксама былі ўзяты ў арэнду тры крамы ААТ «Саўгас-камбінат «СОЖ». Меры па пашырэнні сеткі фірменнага гандлю дазволілі заўважна павялічыць тавараабарот. У планах — далейшае пашырэнне фірменнай гандлёвай сеткі. Гэта дазволіць паскорыць паступленне грашовых сродкаў на разліковы рахунак і павялічыць выручку ад рэалізацыі.



**У фірменнай краме агракамбіната «Паўднёвы» заўсёды самыя свежыя і смачныя вырабы.**

Дзве гаспадаркі, якія далучыліся да прадпрыемства за апошнія 15 гадоў, далі магчымасць атрымліваць уласную сыравіну для вытворчасці камбікармоў. Агульная плошча сельгасугоддзяў цяпер складае 7109 гектараў. З іх раллі — 5480 га. Летась было нарыхтавана 29,7 цэнтнера кармавых адзінак травяных кармоў на адну ўмоўную галаву. Ураджайнасць збожжа кукурузы склала 94,3 ц/га, а тэмп росту па вытворчасці прадукцыі раслінаводства — 106,7 % да 2017 года.

— У нашым агракамбінаце 5574 галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку кароў — 2205, — расказвае Мікалай Аркадзьевіч. — Для статка мы нарыхтоўваем сілас, сянаж, дадаём здробленую салому і ўсе неабходныя карысныя кампаненты. Мы нарыхтоўваем неабходны аб'ём кармоў, каб утрымліваць 30 тысяч свіней. Дарэчы, кармоў у нас хапае заўсёды. За тры апошнія гады мы пабудавалі шэсць сіласных траншэй аб'ёмам да 3,5 тысячы тон. Сёлета будзем весці рэканструкцыю тых, хто дзейнічае. Паступовa пабудуем яшчэ некалькі і аднachасова павялічым аб'ём закладкі — да 3,5—4 тысяч тон у кожную.

Адна з самых важных задач, якая стаіць перад вялікім працоўным калектывам — а ў гаспадарцы зараз працуе звыш 700 чалавек, — павышэнне эканамічнай эфектыўнасці вытворчасці на аснове зніжэння сабекошту прадукцыі. Работа ў гэтым кірунку дазволіць павялічыць канкурэнтаздольнасць прадукцыі, палепшыць фінансавае становішча прадпрыемства, а значыць і дабрабыт людзей, — адзначае **намеснік дырэктара Вольга ЧАБРОВА.**

— Сёння супрацоўнікі агракамбіната атрымліваюць годны заробак. Сярэдні цяпер складае 713 рублёў. Аднак планы ў нас вялікія. Будзем вырашаць адказныя задачы па рэжыме эканоміі ўсіх матэрыяльных рэсурсаў і росту аб'ёмаў вытворчасці. Трэба імкнуцца атрымаць 10600 тон зерня, у тым ліку кукурузы на збожжа — 4000 тон. Рэальная задача — нарыхтаваць не меней чым 30,3 цэнтнера кармавых адзінак травяністых кармоў на адну ўмоўную галаву. У планах — вырабіць і рэалізаваць 4729,5 тоны свініны і атрымаць 49 000 галоў прыплоду парасят.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

УНП 400047554



**Якасць канчатковага прадукту пасля перапрацоўкі алейных культур дэманструе тэхнік-лабарант Святлана ПІМЕНАВА.**

# СПАЖЫВЕЦ ДАВЯРАЕ «УРЫЦКАМУ СТАНДАРТУ»

**КСУП «Урыцкае» — адно з найбуйнейшых сельскагаспадарчых прадпрыемстваў Гомельшчыны, якое спецыялізуецца на адкорме буйной рагатай жывёлы, вытворчасці малака, раслінаводстве, прамысловай перапрацоўцы і рэалізацыі сельскагаспадарчай прадукцыі. Дарэчы, арганізацыя мае ўласную гандлёвую сетку.**




Жывёлагадоўчая галіна — асноўны прыбытак для гаспадаркі. На пачатак года статак буйной рагатай жывёлы складаў амаль 11 тысяч галоў. Валавы надой малака летась — звыш 13,5 тысячы тон, у тым ліку адбылося павелічэнне да ўзроўню 2017 года. Удой малака на карову — 5289 кілаграмаў. Вызначылася тэндэнцыя да яго росту — 100,3 %.

Што датычыцца гадавання свінняў, пагалоўе якіх складае больш чым 5,5 тысячы галоў, летась ад рэалізацыі свінагадоўчай прадукцыі тут атрымалі прыбытак 249 тысяч рублёў, а рэнтабельнасць склала 26,1 %, кажа **дырэктар гаспадаркі Андрэй САХАНКОЎ**:



— Перад галіной раслінаводства заўсёды стаіць задача па забеспячэнні жывёл разнастайнымі кармамі. Ва ўмовах няўстойлівага надвор'я важна тэрмінова зарыентавацца, якую культуру лепш сеяць. Летась быў не самы лепшы сельскагаспадарчы год. Мы нарыхтавалі звыш 42 тысяч тон сіласу, больш чым 15 тысяч тон сенажу, 1,5 тоны сена, што ў пераліку на ўмоўную галаву жывёлы склала 21,5 цэнтнера кармавых адзінак. Спадзяёмся, што сёлета больш пашанцуе з надвор'ем.

Важную ролю ў выкананні ўсіх прагнозных паказчыкаў мае работа цэха механізавання. Пастаяннае абнаўленне тэхнікі — сярод прыярытэтаў КСУП «Урыцкае». На палетках працуюць 73 імпартныя і айчынныя высокапрадукцыйныя трактары розных мадыфікацый, сеялкі, культыватары, трактары, 39 грузавых аўтамабіляў і 12 збожжаўборачных камбайнаў.

Летась у КСУП была праведзена рэканструкцыя некаторых памяшканняў жывёлагадоўчага комплексу, рамонт падстрэшка для камбайнаў, боксаў для грузавых аўтамабіляў, гандлёвых павільёнаў, адрыны для цялят на МТФ «Старая Беліца».

Спажыўцы даўно ведаюць смачную прадукцыю прадпрыемства пад брэндам «Урыцкі стандарт». Яе можна набыць у чатырох фірменных крамах і гандлёвых пунктах на рынках Гомеля. У сталовай прадпрыемства апошнім часам значна пашырыўся асартымент гатовых страў, кандытарскіх вырабаў і паўфабрыкатаў.

На тэрыторыі прадпрыемства размешчаны забойны і мясаперапрацоўчы цэхі. Апошні выпускае больш чым 130 найменняў каўбасных і мясных вырабаў.

Праведзены аналіз гаспадарчай дзейнасці прадпрыемства за мінулы год паказвае, што летась было выраблена валавай прадукцыі сельскай гаспадаркі на суму 19 016 тысяч рублёў. Да ўзроўню 2017 года — 100,4 %. Узровень рэнтабельнасці па канчатковым фінансавым выніку склаў 10,7 %.

Для ўсіх супрацоўнікаў — а іх тут больш за 600 — у КСУП «Урыцкае» створаны ўмовы для плённай працы. У гаспадарцы сярэдні заробак цяпер складае 640 рублёў. Прафесійны калектыў ведае, што строгае выкананне тэхналагічных працэсаў як у жывёлагадоўлі, так і ў раслінаводстве — не капрыз кіраўніцтва, а залог выніковай работы.

Дарэчы, усе супрацоўнікі, якія не парушаюць дысцыпліну і маюць выпрацаваную норму рабочага часу, штомесяц атрымліваюць узнагароджанне за вытворчыя вынікі ў натуральнай форме — прадукты харчавання на суму 25 рублёў праз уласныя крамы прадпрыемства. Да дзяржаўных, прафесійных свят усе маюць яшчэ і дадатковыя наборы прадуктаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

УНП 400201031




**✓ Агульны зямельны фонд КСУП «Урыцкае» вельмі вялікі і складае 12 294 гектары зямлі, з іх 10 752 — сельскагаспадарчыя ўгоддзі.**

**✓ Калгас «Урыцкае» быў утвораны ў 1931 годзе. Двойчы адбывалася ўзбуйненне гаспадаркі за кошт далучэння найбліжэйшых.**

**✓ Першае згадванне вёскі Валковічы (потым Урыцкае) даводзіцца на 1560 год. Адным з асноўных гаспадароў земляў у старосце быў Лявонцій Воўк. Верагодна, што ад яго прозвішча пайшла і гістарычная назва вёскі Валковічы. У сувязі з наяўнасцю крупнастага млына вёска змяніла сваю назву на Валкавіцкі Крупец. У 1926 годзе быў выкананы план паставак дзяржаве, і вяскоўцы звярнуліся ў вышэйшыя органы з просьбай аб перайменаванні сяла і сельсавета. І з 1 студзеня 1927 года населены пункт стаў звацца Урыцкае — у гонар рэвалюцыянера Маісея Саламонавіча Урыцкага.**

**✓ За высокія працоўныя паказчыкі 19 лютага 1976 года калгас быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, а яго тагачасны старшыня Аркадзь Паташкін атрымаў званне Героя Сацыялістычнай Працы з уручэннем ордэна Леніна.**

# УНІКАЛЬНЫЯ МАШЫНЫ АД ААТ «БАЛЬШАВІК»

## Выкананне заказаў на арыгінальнае абсталяванне патрабуе творчага падыходу



Міхаіл ШПАКОЎСКІ.

**ААТ «Завод тарфянога машынабудавання «Бальшавік» амаль 90 гадоў знаходзіцца ў аднайменным рабочым пасёлку недалёка ад Гомеля. Прадпрыемства выпускае самае разнастайнае абсталяванне для тарфяной прамысловасці і торфабрыкетных заводаў. Акрамя таго, вырабляе крапеж для вузкакалейнай чыгункі, запасныя часткі да абсталявання для здабычы торфу.**

Дзякуючы кваліфікаваным спецыялістам, шматгадоваму досведу працы, сучаснаму тэхналагічнаму абсталяванню, новым распрацоўкам, укаранёным у вытворчасць, завод выконвае заказы вялікіх аб'ёмаў рознай складанасці. Напрыклад, тут ганарацца апошнім вагонаперакульнікам, які напрыканцы мінулага года адправілі да заказчыкаў у Мінскую вобласць — упершыню ў сабраным выглядзе. Унікальны агрэгат, дарэчы, важыць 30 тон. З прадпрыемства нядаўна выйшла і абсалютна новая для краіны машына, прызначаная для пажаратушэння, — на гусенічнай хадзе. У адрозненне ад той, што на колах, новая можа дабрацца ў самыя цяжкадаступныя месцы.

**Ганаровы работнік газавай і паліўнай прамысловасці Міхаіл ШПАКОЎСКІ** тут стаў дырэктарам адносна нядаўна. За мінулы год выручка ад рэалізацыі прадукцыі на прадпрыемстве склала 3550 тысяч рублёў — гэта 120,3 % да адпаведнага перыяду 2017 года. Рэнтабельнасць продажу цяпер 3,4 %, а экспарт у Расію і краіны Прыбалтыкі — 17,4 тысячы долараў:

— Мы сёння працуем рэнтабельна і прыбыльна, — адзначае Міхаіл Мікалаевіч. — Каля 4,5 % сваёй прадукцыі адпраўляем за межы краіны. Пакуль гэта нямнога, але спадзяёмся павялічваць. Сёння я ўпэўнены ў калектыве. За год мы паднялі заробкі, і сярэдні складае 764 рублі. Многія кваліфікаваныя рабочыя зарабляюць больш чым 1000. Работа ў нашых супрацоўнікаў — а гэта 81 чалавек — ёсць пастаянна. Між іншым, у нас працуюць не толькі мясцовыя жыхары. Сюды прыязджаюць і з Касцюкоўкі, і з Яроміна, і з Гомеля. Людзі ведаюць, што тут можна рабіць і зарабляць.



Начальнік механічнага цэха Аляксандр ШАЎЦОЎ і токар Анатоль ШАЛЫГІН.

Завод рэалізоўвае машыны для ўборкі фрэзернага торфу МТФ-43А-К, фрэзерны барабан Ф-6,5, прычэп-самаскід гусенічны МТП- 24В-М, карчавацель актыўнага тыпу КАП-2; машыну МПК-1 для рамонту картавых каналаў, вагонаперакульнік вузкакалейны ВУ-1.00.00.000, валкавальнік фрэзернага торфу ВТ-9,8 і многае іншае. Сёння прадпрыемства ажыццяўляе яшчэ і дробнасерыйную вытворчасць. Тут, калі патрэбна, зробяць вырабы ці металаканструкцыі па чарцяжах заказчыка. Выкарыстоўваюць пры неабходнасці і плазменнае рэзанне.





Начальнік вытворчага аддзела Ганна КАЧУБЕЙ і слесар механазборачных работ Пётр АФАНАСЬКОЎ.

— Цяпер мы забяспечаны заказамі па вырабе як абсталявання для паліўнай прамысловасці, так і запчастак да яго, — дадае Міхаіл Шпакоўскі. — Ёсць заказы для Расійскай Федэрацыі і абмяркоўваюцца новыя. Праект па выпуску торфавозных вагонаў для вузкай каляі знаходзіцца на экалагічнай экспертызе. На першае паўгоддзе 2019 года плануецца выраб абсталявання для ААТ «Торфапрадпрыемства Колпеніца». У планах — стварэнне сумеснай вытворчасці па вырабе партатыўных вышак на базе невялікіх машын для выкарыстання ў галіне ЖКГ. Напрыканцы мне вельмі хочацца выказаць шчыры «дзякуй» інжынерна-тэхнічным супрацоўнікам нашага прадпрыемства і ўсяму калектыву за самаадданую працу. Думаю, разам у нас усё атрымаецца!

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

УНП 400047488

**✓ Прадпрыемства было заснавана ў 1930 годзе. Доўгі час яно забяспечвала найбліжэйшыя буйныя гомельскія прадпрыемствы палівам — кускавым торфам. З 1960 года пачалася здабыча фрэзернага торфу і вытворчасць тарфяных брыкетаў. Адначасова ў механічнай майстэрні асвойвалася вытворчасць спецыяльнага тэхналагічнага і нестандартызаванага абсталявання. Такім чынам, з уводам у 1969 годзе новага механічнага цэха, завод стаў найбуйнейшым у сваёй галіне. Пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС здабычу торфу давялося спыніць цалкам.**

**✓ Дзесяць гадоў таму прадпрыемства стала адкрытым акцыянерным таварыствам са 100-працэнтнай доляй дзяржавы ў статутным фондзе. Уласнікам перададзенага ў валоданне і карыстанне без права распараджэння маёмасцю з'яўляецца Рэспубліка Беларусь у асобе Міністэрства энергетыкі Рэспублікі Беларусь.**

**✓ Кацельня прадпрыемства акрамя прамысловай зоны сёння ацяпляе ўвесь рабочы пасёлак Бальшавік: гэта два дзіцячыя садкі, бальніца, жылы фонд і іншыя аб'екты. Таксама прадпрыемства аказвае паслугі па водазабеспячэнні і водаадвядзенні ў пасёлку Бальшавік.**

Спорт-тайм

# Пяць узнагарод на Кубку свету

У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» мы расказваем пра вынікі выступлення беларускіх спартсменаў на спаборніцтвах па веславанні і іншыя міжнародныя турніры

**1. Пяць узнагарод заваявалі беларускія атлеты на першым этапе Кубка свету па веславанні на байдарках і каноэ ў Познані (Польшча).** На дыстанцыі 500 м у байдарцы



Вольга Худзенка паднялася на другую прыступку п'едэстала, сярэбраны медаль у каноэ-двойцы на 200 м заваявалі беларусы Глеб Саладуха і Дзяніс Махлай. Раней «золата» на дыстанцыі 500 м у байдарцы-двойцы здабылі Вольга Худзенка і Марына Літвінчук, Алег Юрэня ў байдарцы на 1000 м паказаў другі вынік, а Арцём Козыр у каноэ на 200 м заняў трэцяе месца.

**2. На Генеральнай асамблеі Міжнароднай федэрацыі баскетбола (FIBA) у Еўропе, якая прайшла ў Мюнхене, адбыліся выбары кіруючых органаў арганізацыі.** Генеральны сакратар і выканаўчы дырэктар Беларускай федэрацыі баскетбола Настасся Марыніна выбрана ў склад выканкама ФІБА-Еўропа. На 23 месцы прэтэндавалі 38 кандыдатаў, Беларусь атрымала 36 галасоў. У склад выканкама ўвайшлі 23 прадстаўнікі нацыянальных федэрацый.

**3. Футбалісты салігорскага «Шахцёра» ў трэці раз сталі ўладальнікамі Кубка Беларусі, абыграўшы ў фінале «Віцебск» з лікам 2:0.** Лік адкрыў аўстрыйскі легіянер «Шахцёра» Дарка Бодул, а другі гол на рахунку сербскага абаронцы Ніколы Анціча.

Футбалісты «Шахцёра» трэці раз у гісторыі заваявалі Кубак Беларусі. Да гэтага яны выйгравалі трафей у 2004 і 2014 гадах, а яшчэ пяць разоў саступалі сапернікам у фінальных паядынках. Па тры разы Кубак заваёўвалі таксама футбалісты мінскага «Дынама», барысаўскага БАТЭ, бабруйскай «Белшыны» і брэсцкага «Дынама».



**4. Хакеісты Фінляндыі сталі чэмпіёнамі свету 2019 года, у фінале яны перайгралі зборную Канады з лікам 3:1.** Уладальнікамі бронзавых узнагарод сталі расіяне.

Для хакеістаў Фінляндыі залатыя медалі сусветнага форума трэція ў гісторыі. Раней яны рабіліся першымі ў 1995 і 2011 гадах.

Пасля завяршэння 83-га чэмпіянату свету ў Славакіі стаў вядомы папярэдні склад груп на наступны турнір



у 2020 годзе ў Швейцарыі. Зборная Беларусі, якая займае 14-е месца ў спісе IIHF, згуляе ў элітным дывізіёне чэмпіянату са зборнымі Канады, Швецыі, Чэхіі, Славакіі, Швейцарыі, Даніі і Вялікабрытаніі. У другой групе аказаліся каманды Расіі, Фінляндыі, ЗША, Германіі, Латвіі, Нарвегіі, Італіі і Казахстана. 84-ы чэмпіянат свету пройдзе з 8 да 24 мая 2020 года ў швейцарскіх гарадах Цюрых і Лазана.

**5. Беларускія валейбалісткі перамаглі Азербайджан з лікам 3:2 на старце Залатой Еўралігі.** Найбольш выніковымі гульцамі ў гаспадароў пляцоўкі сталі Надзея Столяр (17 ачкоў) і Ганна Клімец (13 ачкоў).

У іншым матчы групы С валейбалісткі Іспаніі абыгралі Фінляндыю — 3:1. У другім туры Залатой Еўралігі жаночая зборная Беларусі 29 мая згуляе ў Мінску з Фінляндыяй.

Мужчынская зборная Беларусі ў першым туры Залатой Еўралігі перамагла Чэхію з лікам 3:1. У другім туры Залатой Еўралігі мужчынская зборная Беларусі згуляе 29 мая на пляцоўцы «Чыжоўка-Арэны» з Фінляндыяй.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Даты | Падзеі | Людзі

**28 МАЯ**

У краіне

**1569** год — горад Перабродзе (сёння гэта вёска ў Мёрскім раёне Віцебскай вобласці) атрымаў Магдэбургскае права. Горад узнік на месцы рыбацкага пасёлка і, па мясцовым павер'і, атрымаў гарадскія правы за тое, што яго жыхары паказалі брод праз возера самому каралю. У 1792 годзе быў зацверджаны герб Перабродзя — на блакітным полі гарчычнага колеру харугва са срэбнымі нашыўкамі з тасьмы. У 1782 годзе ў Перабродзі была пабудавана драўляная уніяцкая царква святога Юрыя, пры якой працавала школа для 40 вучняў. У 1812 годзе праз горад праходзілі падчас адступлення рускія войскі на чале з галоўнакамандуючым Барклаем-дэ-Толі. Гарадскія правы Перабродзя двойчы пацвярджаліся Сенатам — 27 мая 1820 года і 17 чэрвеня 1823 года, але горад так і не дасягнуў эканамічнай незалежнасці.

**1645** год — у горадзе Мазыры заснаваны кляштар і касцёл бернардзінцаў — помнік архітэктуры барока (пабудаваны ў 1648 годзе; у 1865-м касцёл перайтвораны ў Міхайлаўскі сабор).

**1918** год — Саўнаркам Савецкай Расіі прыняў Дэкрэт аб заснаванні памежнай аховы. У Рэспубліцы Беларусь Дзень пагранічніка, згодна з указам Прэзідэнта, адзначаецца з 1995 года.

**1934** год — у Мінску адчыніў дзверы для пакупнікоў найбуйнейшы магазін горада — ГУМ. Галоўны яго будынак знаходзіўся праз адзін квартал ад сённяшняга, на рагу вуліц Савецкай і Камсамольскай (цяперашняе скрыжаванне праспекта Незалежнасці і вуліцы Камсамольскай).



**1959** год — нарадзіўся Сяргей Антонавіч Чыжык, першы намеснік старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, акадэмік НАН Беларусі, доктар тэхнічных навук, прафесар, загадчык лабараторыі Інстытута цепла- і масаабмену імя А. В. Лыкава НАН Беларусі, вучоны ў галіне фізікі і механікі паверхняў на мікра- і нанаўзроўні, нанадыягностыкі. Аўтар і кіраўнік метадаў, стваральнік тэарэтычных мадэляў і ўнікальнага абсталявання для комплекснага аналізу паверхняў на нанаўзроўні. Пад яго кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле выканана распрацоўка і ўпершыню з 1994 года наладжана вытворчасць айчынных атамна-сілавых мікраскопаў серый «Нанатоп» і «Нанатэстар», якія выкарыстоўваюцца ў дзясятках навуковых і заводскіх лабараторый краіны, а таксама пастаўляюцца за мяжу. Аўтар больш чым 280 навуковых прац, у тым ліку дзвюх манаграфій, і сямі патэнтаў.

У свеце

**1858** год — заключаны руска-кітайскі Айгунскі дагавор аб мяжы, гандлі і па іншых пытаннях (Айгун — горад у паўночнай Маньчжурыі). Гэтая дамова дазволіла Расіі вярнуць тэрыторыі, аддадзеныя раней Кітаю. Асноўным прадметам дагавора было праходжанне расійска-кітайскай мяжы. Бакі згаджаліся наконт таго, што левы бераг Амура ад ракі Аргунь да вусця прызнаецца ўласнасцю Расіі, а Усурыйскі край ад упадзення Усуры ў Амур да мора застаецца ў агульным валоданні надалей да вызначэння мяжы. Суднаходства па рэках Амур, Сунгары і Усуры было дазволена толькі рускім і кітайскім суднам і забаронена для суднаў усіх іншых краін.

**1895** год — нарадзіўся Уладзімір Аляксеевіч Дабрынін, савецкі канструктар авіяцыйных рухавікоў, доктар тэхнічных навук. Забяспечваў падрыхтоўку рухавікоў для беспасадачных пералётаў экіпажаў В. П. Чкалава і М. М. Громава. У далейшым стварыў шэраг узораў поршневых і турбарэактыўных рухавікоў для самалётаў А. М. Тупалева і У. М. Мясішчава. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Памёр у 1978 годзе.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.49 | 21.25 | 16.36 |
| Віцебск — | 4.31 | 21.22 | 16.51 |
| Магілёў — | 4.39 | 21.15 | 16.36 |
| Гомель — | 4.44 | 21.04 | 16.20 |
| Гродна — | 5.06 | 21.39 | 16.33 |
| Брэст — | 5.15 | 21.31 | 16.16 |

## Месяц

*Апошняя квадра 26 мая. Месяц у сузор'і Авена.*

## Імяніны

*Пр. Дзмітрыя, Ісая, Макара, Пахома.*
*К. Інгі, Эміліі, Аўгусціна, Вільгельма, Германа, Яраміра.*



Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Як я выйшла замуж? Ды вельмі проста. Я паіла яго тры дні, а потым прыцягнула ў ЗАГС і сказала: «Мы на пошце, табе прыйшла бандэроль — распішыся».**

На пляжы:

— Паважаныя студэнты, не заплывайце за буйкі, ужо дзве акулы падавіліся.

**Наташа не верыла ва ўсякія знакі. Таму ў яе адабралі правы.**

Ён і яна.

— Паехалі ў рэстаран...

— Цудоўна, паехалі!

— Ды не перапыняй ты! Паехалі адзін раз у рэстаран рускі, амерыканец і немец...



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1608.

Нумар падпісаны ў 19.30 27 мая 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12